# КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ Ў АЛЬШЭВА

Гаспадары сядзібна-паркавага комплексу ў Альшэва былі не толькі працавітымі, адукаванымі і гаспадарлівымі людзьмі, але і актыўнымі прыхільнікамі мастацтва і літаратуры. Не здарма сярод Хамінскіх былі таленавітыя журналісты, драматургі, пісьменнікі. Гэтыя мясціны сапраўды натхнялі на творчасць, і спрыяла гэтаму не толькі прыгожае наваколле, але і культурнае азяродзе дому, якое складалася шмат дзесяцігоддзяў і нават стагоддзяў.

Напрыклад, сапраўдная карцінная галерэя ўпрыгожвала сцены сядзібы, якую можна было падзяліць на дзве часткі: сямейную і калекцыйную. У сямейнай галерэі налічвалася каля 20 напісаных алеем партрэтаў Хамінскіх. Сярод якіх вылучаліся партрэты: Людвіка Якуба Хамінскага, працы віленскага майстра Жахоўскага (другая палова XVII ст.), Тадэвуша Хамінскага і яго жонкі Тэрэзы з Аскеркаў пэндзля Яна Рустэма і генерала Станіслава Хамінскага працы Валенція Ваньковіча, вучня Рустэма (зараз карціна захоўваецца ў Польшчы ў музеі “Вілянов”). Таксама былі сямейныя партрэты працы Я. Хруцкага і К. Рыпінскага.

Акрамя карцін меўся бронзавы барэльеф генерала Хамінскага, невядомага аўтарства.



**Станіслаў Хамінскі**
**В. Ваньковіч, 1828 год**

На стан 1920-1930-х гадоў па літаратурным крыніцам вядома невялікае апісанне калекцыйнай часткі галерэі. У Альшэва захоўваліся працы такіх мастакоў як:

●**Міхал Руба** (1893-1941) – *было 5 пейзажаў у стылі імпрэсіянізм.*

●**Уласціміл Хофман** (1881-1970) – *у калекцыі былі два партрэты: “Галава дзяўчынкі” і “Дзяўчынка, сядзячая над вадой”.*



**“Галава дзяўчынкі”, 1928 год**

●**Вацлав Дыжанскі** (1874 - ?) – *меўся адзіны пейзаж, назва карціны не вядомая.*

●**Евгеніюш Казіміроўскі** (1873-1939). *У сядзібе захоўвалася пяць пейзажаў майстра, назвы якіх на жаль не вядомыя. Амаль усе карціны мастака апасля ваенных падзей XX стагоддзя былі страчаны, але адну з яго галоўных прац - “Цудатворны абраз Ісуса Міласэрнага" («Ісус, спадзяюся на Цябе»), можна і зараз пабачыць у храме Міласэрнасці божай у Вільнюсе. Не так даўно высветлілася, што на тэрыторыі Беларусі таксама засталіся ягоныя творы: у касцёле ў вёсцы Ваўкалаты Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці былі знойдзены 2 эскізы да іконы “Цудатворны абраз Ісуса Міласэрнага".*




**Е. Казіміроўскі, 1934 год**

●**Тымон Несялоўскі** (1882-1965) - *захоўваліся нацюрморт і пейзаж.*



**Нацюрморт Т. Несялоўскага**

● **Браніслаў Ямант** (1886-1957) – *у калекцыі было два пейзажы.*

Можна не сумнявацца, што таленавітыя і знакамітыя людзі свайго часу адведвалі Альшэва з моманту яго заснавання. Па ўспамінам сучаснікаў, пачынаючы з 1920-х гадоў, Людвік і Стэфанія Хамінскія зрабілі з маёнтка сапраўдную культурную прастору, якую адведвалі паважаныя госці:

●**Ян Булгак** - *фатограф, адзін з піянераў беларускай і польскай мастацкай фатаграфіі, для якога спецыяльна для праяву фатаграфій быў зроблены ў сядзібе цёмны пакой. Я. Булгак неаднаразова бываў у Нарачанскім краі і выдаў кнігу сваіх фотаздымкаў "Narocz - najwieksze jezioro w Polsce" у кніжным выдавецтве Людвіка Хамінскага.*

●**Станіслаў Лорэнц** – *даследчык музеялогіі і гісторыі мастацтва, дырэктар Нацыянальнага музея ў Варшаве (1935-1985).*

●**Адам Лысакоўскі** - *дырэктар Віленскай універсітэцкай бібліятэкі.*

●**Уладзіслаў Умінскі** - *пісьменнік-фантаст, журналіст і навуковы педагог.*

●**Браніслаў Урублеўскі** - *прафесар-юрыст і рэктар Віленскага ўніверсітэта і яго жонка* - мастачка **Крысціна Урублеўская**.

●**Казімір Квяткоўскі** і **Фердынанд Рушчыц** - *знакамітыя мастакі.*

●**Гелена Ромер-Ахенкоўская** - *пісьменніца і журналістка.*

Калі ў 1935 годзе прадпрыемствы Людвіка Хамінскага абанкруціліся, маёнтак Альшэва быў закладзены ў банк. З гэтага году ў Альшэва быў зроблены летні пансіянат за асобную плату для адпачываючых. Думаецца, што ў гэты перыяд яшчэ больш творчых людзей адведвалі Хамінскіх у прыгажэйшым краі Блакітных азёр.

Захаваліся ўспаміны дзяўчынкі Хэлены Завістоўскай, якая як раз адпачывала ў Альшэва ў 1935 годзе:

**"... Уладальнік сядзібы, Людвік Хамінскі быў вельмі сімпатычным чалавекам з выдатным пачуццём гумару. Ён часта сядзеў з гасцямі за адным сталом у сталовай, жартаваў і расказваў анекдоты. Вялізны стол у сталовай быў засланы белым абрусам, на ім пакладзены белыя сурвэткі з вышытымі вензелямі, талеркі і сталовыя прыборы з гербамі Хамінскіх. За сталом служылі дзве дзяўчыны ў чорных сукенках, белых накрухмаленых фартухах у белых карунках у валасах. Дзяцей абслугоўвалі за асобным сталом..."**

**Успаміны Хэлены Завістоўскай.**
**"Od Wilii po Ukle"**
**Гданьск, 2011.**

На сённяшні дзень гэта ўсё, што можа даць уражанне ад таго, як, працякала культурнае жыццё ў Альшэўскай сядзібе ў розныя гады.

Апасля 1939 года лёс фамільных каштоўнасцей і карцін не вядомы. Можна толькі спадзявацца, што нейкім цудам нешта змагло захавацца.